Зыгмантовіч С.В.,
дацэнт

# АБ ВЫКЛАДАННІ КУРСА ПА ВЫБАРУ «ВЫВУЧЭННЕ ЭФЕКТЫЎНАСЦІ БІБЛІЯГРАФІЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ»

Задача павышэння эфектыўнасці бібліяграфічнай дзейнасці заўсёды адносілася да ліку важнейшых у справе развіцця бібліяграфічнай практыкі. Яшчэ большую актуальнасць набывае яна ў сучасных умовах у сувязі з неабходнасцю інтэнсіфікацыі бібліяграфічнай дзейнасці, укараненнем у работу бібліятэк эканамічных метадаў гаспадарання, павышэннем ролі мэтанакіраванага, навукова абгрунтаванага кіравання. Разам з тым у асноўных спецыяльных агульных і галіновых бібліяграфічных курсах, якія выкладаюцца ў Беларускім універсітэце культуры, гэтай праблеме не ўдзяляецца дастатковай увагі.

У бягучым навучальным годзе студэнтам быў прапанаваны ў якасці курса па выбару курс «Вывучэнне эфектыўнасці бібліяграфічнай дзейнасці». Выкладанне названай дысцыпліны прадугледжвае знаёмства студэнтаў як з тэарэтычнымі, так і з практычнымі аспектамі гэтай праблемы. Так, вялікая ўвага ў курсе надаецца метадалагічным пытанням вызначэння самога паняцця «эфектыўнасць бібліяграфічнай дзейнасці», існуючым розным падыходам да яе вывучэння, сістэмнаму разгляду асноўных відаў эфектыўнасці, распрацоўцы спосабаў ацэнкі сістэмы крытэрыяў і паказчыкаў эфектыўнасці і якасці разглядаемага віду дзейнасці.

Разнастайнасць відаў і формаў бібліяграфічнай дзейнасці абумоўлівае неабходнасць разгляду розных відаў эфектыўнасці ў адносінах да асобных напрамкаў гэтай дзейнасці, вызначэння крытэрыяў і паказчыкаў эфектыўнасці падрыхтоўкі і распаўсюджвання бібліяграфічных дапаможнікаў, функцыянавання даведачна-бібліяграфічнага апарату бібліятэкі, ажыццяўлення даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання і бібліяграфічнага інфармавання спажыўцоў, бібліятэчна-бібліяграфічнага і інфармацыйнага навучання чытачоў.

Сістэмны падыход да вызначэння эфектыўнасці і якасці як працэсуальнага, так і выніковага характару бібліяграфічнай дзейнасці патрабуе ад студэнтаў добрага ведання тэхналогіі бібліяграфічнай вытворчасці, асаблівасцей інфармацыйных запытаў спажыўцоў, якасных характарыстык асноўных бібліяграфічных прадуктаў і паслуг. Гэтыя веды студэнты атрымліваюць у розных асноўных бібліяграфічных курсах. Задача разглядаемага курса - навучыць студэнтаў ацэньваць поўна і шматаспектна бібліяграфічную дзейнасць па канчатковых выніках дзейнасці - ступені задавальнення патрэб у інфармацыі спажыўцоў з улікам усіх асноўных элементаў унутранай структуры гэтай дзейнасці: суб'ектаў, аб'ектаў, пастаўленых мэт, працэсаў, выкарыстоўваемых сродкаў і інш.

Вывучэнне сацыяльнай, тэхналагічнай, эканамічнай эфектыўнасці розных відаў і формаў бібліяграфічнай дзейнасці абумоўлівае таксама задачу навучыць студэнтаў карыстацца рознымі навукова-даследчымі метадамі, такімі як апытанне чытачоў (анкетаванне і інтэрв'юіраванне), аналіз спісаў выкарыстанай і цытаванай літаратуры, праца са спецыялістамі -экспертамі, аналіз бібліятэчнай і небібліятэчнай дакументацыі і г.д.

Немалаважнай задачай курса з'яўляецца таксама раскрыццё магчымасцей выкарыстання атрыманых вынікаў вывучэння эфектыўнасці ў дзейнасці будучых спецыялістаў: пры ўдасканаленні бібліяграфічнай дзейнасці, планаванні і прыняцці канкрэтных кіруючых рашэнняў, пры рабоце са спажыўцамі, пры вызначэнні ўкладу кожнага супрацоўніка ў канчатковыя вынікі работы і г.д. На прыкладзе ўжо праведзеных даследаванняў раскрываюцца іх вынікі, робяцца вывады па ўдасканаленню дзейнасці. На занятках разбіраюцца разам са студэнтамі канкрэтныя вытворчыя сітуацыі.

Эфектыўнасць бібліяграфічнай працы залежыць ад розных як суб'ектыўных, так і аб'ектыўных і знешніх фактараў. Веданне гэтых фактараў, асаблівасцей уплыву іх на якасць і выніковасць дзейнасці дазволіць будучым спецыялістам своечасова карэкціраваць ход усяго бібліяграфічнага працэсу, пэўным чынам уплываць на канчатковыя вынікі працы. Таму ў курсе пры разглядзе гэтай тэмы асаблівая ўвага сярод іншых фактараў, такіх як забяспечанасць першаснымі дакументамі, стан бібліяграфічных рэсурсаў, матэрыяльна-тэхнічная база, інфармацыйная падрыхтоўка спажыўцоў, надаецца кадравай праблеме, падрыхтоўцы бібліёграфаў і іх расстаноўцы ў адпаведнасці з аб'емам і складанасцю выконваемых функцый, псіхалагічнай характарыстыцы і г.д.

Да асноўных праблем змястоўнага раскрыцця разглядаемага курса адносяцца: адсутнасць стандартаў на бібліяграфічную прадукцыю і паслугі як аб'ектыўнай асновы для вызначэння іх якасці; адсутнасць абагульняючых навуковых работ і работ вучэбна-метадычнага характару; малая ўвага да дадзеных праблем (па выніках аналізу планаў работы і планаў навуковых даследаванняў) з боку навуковых, навучальных устаноў і бібліятэк рэспублікі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ